Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 1. Варыянт 3**

**Білет 17. Практычнае заданне.** Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Удзел БССР у стварэнні СССР. Узбуйненне тэрыторыі БССР.

**Заданні склаў:**Рудак Віталь Уладзіміравіч, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА "Махнавіцкая сярэдняя школа Мазырскага раёна"

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Зыходзячы са звестак крыніц назавіце дату ўтварэння першай беларускай савецкай дзяржавы.
2. Абапіраючыся накрыніца I укажыце, дзякуючы якім падзеям на думку ўрада савецкай Беларусі стала магчымым стварэнне першай беларускай савецкай дзяржавы?
3. Ці згодны вы з меркаваннем удзельнікаў IV Усебеларускага з'езда Саветаў, якія лічылі, што стварэнне СССР з'яўлялася фармальным актам? Свой адказ абгрунтуйце.
4. Зыходзячы з крыніц вызначыце, якія тэрытарыяльныя змены зведала Савецкая Беларусь у 1920-х гг., і параўнайце тэрыторыі БССР 1926 г. і сучаснай Рэспубліцы Беларусь.

**Крыніца I**

**З Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі ад 1 студзеня 1919 г.**(у арыгінале)

«…Беларусь працоўных і бедных сялян… прычашчаюцца да новага вольнага жыцця, якая будуецца на закладзінах камунізму, на фундаманце міжнароднай злукі працоўнага люду. Вялікая Акцябарская равалюцыя ў Расіі… залажыла падмурак новага ўладкавання жыцця з уласцю самога працоўнага народа. Пачаўшы з Расеі, яна запаліла таксама агонь і ўсясьветнага аслабаджэньня працоўнага народу ад прыгону…

Часовае Работніча-Сялянская Урада Савецкай Беларускай Незалежнай Рэспублікі абвяшчаючы перад усім сьветам:

1) З гэтага момэнту ўся ўласць на Беларусі прыналежыць толькі Саветам работнічых, селянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў… <…>

6) Рабочыя, сяляне і працаўнікі ўсіх нацыянальнасьцяў, якія жывуць на абшары Беларусі, карыстаюцца роўным правам і знаходзяцца пад абаронаю равалюцыйных законаў.

7) Уся зямля памешчыкаў і наогул буйных земляўласнікаў, манастыраў, царквоў і касьцёлаў і духаўнікоў, са ўсім жывым і мёртвым багацьцем (інвентарам), а таксама ўсе лясы, воды і нутры зямлі становяцца дастаткам працоўнага народа Беларусі…»

**Крыніца II**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**З пастановы IV Усебеларускага з'езда Саветаў аб стварэнні СССР ад 18 снежня 1922 г.**

«Чацвёрты Усебеларускі з'езд Саветаў працоўных, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў лічыць, што прапанова Усеўкраінскага з'езда Саветаў аб неадкладным афармленні ўжо фактычна існуючага Саюза Савецкіх Рэспублік, аб'ядноўваючы супраць адзінага фронту сусветнага капіталу сілы працоўных і сялян усіх савецкіх рэспублік на асновах узаемнай роўнасці, цеснай сувязі, у той жа час забяспечваючы самастойнае нацыянальна-культурнае будаўніцтва і ствараючы неабходныя гарантыі для праяўлення гаспадарчай ініцыятывы кожнага з членаў, адпавядае жыццёвым інтарэсам Савецкай Беларусі і таму павінна атрымаць больш хуткае ажыццяўленне на маючым адбыцца з'ездзе ўсіх савецкіх рэспублік.

IV з'езд Саветаў Беларусі выказвае сваю глыбокую ўпэўненасць, што з'езд РСФСР сумесна з прадстаўнікамі Украіны, Беларусі і Закаўказскіх рэспублік ставрае адзіны, моцна згуртаваны саюз працоўных усіх брацкіх рэспублік, даручае сваёй дэлегацыі, якая выбіраецца для ўдзелу на Усерасійскім з'ездзе Саветаў. і здзейсніць фармальныя акты, якія замацоўваюць брацкі Саюз Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік».

**Крыніца III. Картасхема**«Беларусь па ўмовах Рыжскай мірнай дамовы. Узбуйненне БССР».



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Адказ:
1.1 студзеня 1919 г. (крыніца І)

2. Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Расіі дала народам Расійскай імперыі імпульс на будаўніцтва нацыянальных дзяржаў на савецкай аснове. Цытата з крыніцы І: «Вялікая Акцябарская равалюцыя ў Расіі… залажыла падмурак новага ўладкавання жыцця з уласцю самога працоўнага народа. Пачаўшы з Расеі, яна запаліла таксама агонь і ўсясьветнага аслабаджэньня працоўнага народу ад прыгону».

3.Згодзен. Савецкая дзяржава, у якую ўваходзілі Беларусь, Украіна, Закаўказзе і савецкая Расія ўжо фактычна існавала, заставалася толькі замацаваць саюз дакументальна. Прадстаўнікі савецкіх дзяржаў ехалі на Усерасійскі з'езд саветаў у Маскву толькі фармальна паставіць подпісы пад заканадаўчымі актамі. Цытата з крыніцы ІІ:
«…прапанова Усеўкраінскага з'езда Саветаў аб неадкладным афармленні ўжо фактычна існуючага Саюза Савецкіх Рэспублік…
IV з'езд Саветаў Беларусі выказвае сваю глыбокую ўпэўненасць, што з'езд РСФСР сумесна з прадстаўнікамі Украіны, Беларусі і Закаўказскіх рэспублік стварае адзіны, моцна згуртаваны саюз працоўных усіх брацкіх рэспублік, даручае сваёй дэлегацыі, якая выбіраецца для ўдзелу на Усерасійскім з'ездзе Саветаў. і здзейсніць фармальныя акты, якія замацоўваюць брацкі Саюз Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік»

4. Тэрытарыяльныя змены Савецкай Беларусі:
1919 г. - стварэнне ССРБ у адпаведнасці з межамі пражывання беларусаў.
1921 г. – Рыжская мірная дамова, Заходняя Беларусь адышла ў склад Польшчы.
1924 г. – першае ўзбуйненне.
1926 г. – другое ўзбуйненне.
Тэрыторыя БССР пасля другога ўзбуйнення ў 1926 г. складала прыкладна палову ад сучаснай тэрыторыі. Самымі буйнымі гарадамі былі: Полацк, Орша, Магілёў, Віцебск, Барысаў, Мінск, Слуцк, Бабруйск, Мазыр, Гомель, Рэчыца. Тэрыторыя Заходняй Беларусі з такімі буйнымі гарадамі як Гродна, Навагрудак, Брэст, Пінск пасля Рыжскай мірнай дамовы належала Польшчы.